раіна таксама, як Беларусь і іншыя краіны СНД, апынулася ў сітуацыі эканамічнага крызісу, ён усё больш і больш паглыбляецца. У выніку - працяг падзення ўзроўню жыцця, рэзкі рост беспрацоўя. Гэтыя глабальныя праблемы ў канцэнтраваным выглядзе адлюстроўваюцца і ў турызме.

Змякчыць, мінімізаваць асобныя негатыўныя наступствы пераходнага перыяду заклікана сістэма прафесійнай рэабілітацыі, якая ўключае перакваліфікацыю і перападрыхтоўку "непатрэбных людзей".

У гэтым плане шмат чаго трэба зрабіць Украінскаму інстытуту турызму. Ва ўмовах пераарыентацыі нашай стратнай эканомікі на вытворчасць спажывецкіх тавараў і паслуг важнай крыніцай занятасці робіцца невытворчая сфера, у прыватнасці турызм, накіраваны на мабільны, хутказваротны бізнес. Дынаміка колькасці працуючых тут вызначаецца пашырэннем спажывецкіх выдаткаў і высокай працаёмістасцю.

Такім чынам, развіццё турыстычна-экскурсійнай галіны ў яе розных формах прывядзе да пашырэння і стварэння новых прадпрыемстваў (рабочых месцаў), што ў сваю чаргу запатрабуе паўнавартаснага кадравага забеспячэння, у тым ліку за кошт рэкрутавання ("перепампоўвання") звольненых у іншых галінах. Зразумела, іх трэба адаптаваць да новых умоў работы ў сферы сервісу, арганізаваць тэматычныя курсы індывідуалізаванай падрыхтоўкі: "Уводзіны ў галіну", "Уводзіны ў пасаду" і г.д.

З другога боку, рынкавыя працэсы непасрэдна ўнутры галіны таксама суправаджаюцца адэкватнай рэарганізацыяй працы, скарэкціраванымі формамі кіравання персаналам. Галоўны яго змест - аптымізацыя колькасці калектываў, максімізацыя працоўнай задачы, ацэнка персаналу, фарміраванне дзелавой этыкі і высокай матывацыі, пастаяннага імкнення да авалодання прафесіяй і ведамі, сацыяльная абароненасць работнікаў. Гэтыя кадравыя прыярытэты пакладзены ў аснову вучэбна-тэматычных планаў і праграм даследчыцка-ўкараняльных работ. Узрастае роля аб'ектыўнай ацэнкі персаналу. З улікам сусветнага вопыту трэба будзе адпрацаваць працэдуру ацэнкі, вызначыць крытэрыі сертыфікацыі, рэанімаваць атэстацыю кіраўнікоў, спецыялістаў, работнікаў масавых прафесій. Стварыць і распачаць дзейнасць незалежных спецыялізаваных цэнтраў, псіхолага-сацыялагічных службаў, кіраўніцкіх кансультацый і г.д. У цяперашні час эксперты цэнтр ствараецца пры Украінскім інстытуце турызму.

Па нашым меркаванні, дааду кацыя работнікаў, папераджальная іх перакваліфікацыя з улікам паняроднай падрыхтоўкі і рынкавага попыту на аснове новых інфармацыйных тэхналогій - гэта самая надзейная форма сацыяльнай абароны работнікаў, рэальная магчымасць самавыяўлення.

Адна з задач - фарміраванне праз эканамічнае навучанне непасрэдна на рабочых месцах па прынцыпу "апускання ў вытворчасць" высокай працоўнай матывацыі, якая б дазволіла кожнаму работніку ўбачыць свой асабісты інтарэс (дыферэнцыраванае матэрыяльнае ўзнагароджанне, прафесійная прэстыжнасць, службовая кар'ера).

Украінскі інстытут развіцця турызму лічыць сваей сацыяльнай і прафесійнай задачай забеспячэнне бесперапыннай і папераджальнай адукацыі работнікаў на ўзроўні сусветных стандартаў (уключаючы шматпрофільную і інтэграваную падрыхтоўку, перападрыхтоўку і павышэнне кваліфікацыі), што дазволіць рэалізаваць праграму знешнеэканамічных сувязяў. Гэта дапаможа зрабіць навуковы прагноз доўгатэрміновых перспектыў развіцця індустрыі адпачынку, кадравага патэнцыялу і бягучых патрэб асобных прадпрыемстваў, а таксама канкурэнтназдольнасці розных прафесій, улічваючы таксама запыт на падрыхтоўку да індывідуальнай працоўнай дзейнасці (самастварaемыя рабочыя месцы).

Зразумела, усе гэтыя праблемы павінны вырашацца ў адзіным сацыяльна-эканамічным блоку, узаемаспалучацца з дзяржаўнай палітыкай садзейнічання рацыянальнай занятасці працоўных рэсурсаў. У выніку такі падыход будзе спрыяць далейшаму развіццю вытворчасці.

Самерсава Н.У.,
аспірантка

## ГУЛЬНЯ ЯК СРОДАК ЭКАЛАГІЧНАГА ВЫХАВАННЯ ДЗЯЦЕЙ І ПАДЛЕТКАЎ У СІСТЭМЕ САЦЫЯЛЬНАЙ ПЕДАГОГІКІ

Вядучыя сучасныя тэндэнцыі развіцця тэорыі і практыкі выхавання ў большасці цыві-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

лізаваных краін свету адлюстроўваюць хуткае ўзрастанне ролі сацыяльнай педагогікі. Адным з напрамкаў дзейнасці служб сацыяльнай дапамогі насельніцтву з'яўляецца сфера экалогіі. Дзейнасць педагога-эколага вельмі важная і шматгранная. 1989 год адкрыў дзесяцігоддзе, аб'яўленае Арганізацыяй Аб'яднаных Нацый сусветным дзесяцігоддзем адукацыі ў галіне навакольнага асяроддзя. Значнасць гэтага факта ў тым, што ўвага ўсіх жывучых на зямлі звернута да праблемы, якая не церпіць адкладання ў сур'ёзным падыходзе да яе вырашэння, патрабуе ўдзелу ўсяго чалавецтва ў прадухіленні пагражальнай катастрофы.

Спрыяльныя ўмовы ў гэтай галіне ў значнай ступені залежаць ад працы выхаваўча-адукацыйных устаноў, у тым ліку сацыяльна-педагагічных комплексаў.

Педагог-эколаг у сваёй працы выкарыстоўвае разнастайныя метады выхавання і адукацыі: назіранне, дэманстрацыйныя вопыты, лекцыі, дыскусіі, праекты і эксперыменты, разнастайныя формы агітацыйна-масавай работы.

Вельмі важным і эфектыўным, на наш погляд, сродкам экалагічнага выхавання дзяцей і падлеткаў з'яўляецца гульня. Гульнявая дзейнасць дзяцей уключае многа іншых відаў дзейнасці і таму з'яўляецца універсальнай. Асабліва важна тое, што дзеці ўдзельнічаюць у гульнях без прымусу, з ахватой і цікавасцю. Педагагічна правільнае кіраванне гульнявой дзейнасцю дазваляе пашырыць кругагляд дзяцей, зацікавіць іх прыродаахоўнымі справамі, дапамагае выхоўваць у дзецях пачуццё адказнасці за становішча роднай прыроды.

Сумесна с Рэспубліканскім дзіцячым экалагічным цэнтрам намі распрацавана багатая і разнастайная экалагічная гіратэка, якая мае класіфікацыю ў залежнасці ад педагагічнай мэты кіраўніка, узроставых асаблівасцей вучняў, іх інтарэсаў і захапленняў. У іграцэцы -- экалагічныя конкурсы і спаборніцтвы, віктарыны, завочныя падарожжы ў краіну раслін і жывёл, ролевыя гульні, экалагічныя юмарыны, дыдактычныя і рухомыя гульні, атракцыёны. Вялікім поспехам у дзяцей старэйшага ўзросту карыстаюцца сучасныя шоу-праграмы "Экалагічнае поле цудаў", "Шчаслівы выпадак", "Пяць зорак", "Папараць-кветка" (таксама па экалагічнай тэматыцы).

Распрацоўваючы новыя праграмы па экалагічнаму выхаванню вучняў, педагог-эколаг павінен памятаць, што ў гульнявой дзейнасці раскрываюцца найлепшыя якасці дзіцяці, развіваюцца калектывізм, працаздольнасць, актывізуюцца інтэлектуальныя здольнасці, эмацыянальныя пачуцці.

Сямёнава А.І.,
выкладчык

## ТЭАТРАЛІЗАЦЫЯ ЯК ТВОРЧЫ МЕТАД У ПРАЦЭСЕ РАБОТЫ СТУДЭНТАЎ НАД МАСТАЦКІМ НУМАРАМ

Нягледзячы на ўзрастаючую ролю тэатралізацыі, тэорыя яе распрацоўкі недастатковая, таму сёння няма адзінага разумення сутнасці тэатралізацыі. У сваю чаргу нераспрацаванасць тэарэтычных пытанняў тэатралізацыі адмоўна адбіваецца на практычнай дзейнасці студэнтаў.

Найбольш распаўсюджанай памылкай нашых выпускнікоў у час работы з'яўляецца разуменне тэатралізацыі як элемента мастацкасці, г.зн. прыўнясенне ў нумар мастацкага матэрыялу (песень, музыкі, жартаў, урыўкаў са спектакля).

Другой распаўсюджанай памылкай з'яўляецца падыход да тэатралізацыі як да прыёму адлюстравання. Чытаецца аўтарскі тэкст (верш, байка), а група ўдзельнікаў спрабуе ўсё па сюжэту паказаць.

Трэцяя памылка заключаецца ў наступным. Арганізатар адпачынку імкнецца тэатралізаваць усё разам. Тэатралізацыя такога роду, калі гучна і часта гучыць музыка, калі да месца і не да месца чытаюцца вершы, пазбаўляе масавую культурна-асветніцкую работу яе сацыяльна-педагагічнай глыбіні.

Мы назвалі некаторыя памылкі, якія маюцца ў працэсе навучання па курсу "Работа над нумарам". Цяпер паспрабуем даць азначэнне, што такое тэатралізацыя і як падыходзіць да работы над ёй.

Тэатралізацыя можа быць прыменена не заўсёды, а толькі ў асаблівых умовах, калі патрабуецца асэнсаваць незвычайнае значэнне той ці іншай падзеі, выказаць свае пачуцці ў адносінах да яе. Такім чынам, тэатралізацыя - гэта не звычайны прыём у сацыяльна-педагагічнай дзейнасці, а складаны творчы метад, які



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ